Калі ўязджаеш у Ліду, перад вачамі паўстае прыгожы сучасны горад. Актыўна працуюць буйныя прамысловыя прадпрыемствы, прадукцыя якіх вядома далёка за межамі краіны. Весела гамоняць дзеці, выбягаючы з акуратных хатак, абгароджаных платамі. Наведнікі спяшаюцца да культурна-аздараўленчых і спартыўных комплексаў. Малыя архітэктурныя формы ўпрыгожваюць ціхія чыстыя вулачкі... І толькі Лідскі замак нагадвае пра немалады ўзрост горада. Яго 690-годдзе адсвяткавалі на днях лідчане.

Рыцарскі турнір у Лідскім замку.

СВЯТА ГОРАДА З РАМАНТЫЧНАЙ НАЗВАЙ

Імі ганарыцца Лідчына

Як тая свавольная дзяўчына, Ліда паказвала свой капрызны характар. Аднак наперакор дажджліваму надвор'ю лідчане пакінулі хатнія справы і выйшлі на вуліцы горада, каб разам адзначыць яго юбілей. Для некаторых мясцовых жыхароў гэты дзень стаў асабістым святам: ім прысвоілі званне «Ганаровы грамадзянін Лідскага раёна».

— 690 гадоў — вялікі шлях для любога горада, — зазначыў **старшыня Лідскага раённага выканаўчага камітэта Аляксандр АСТРОЎСКІ.** — Ці быў ён для Лідчыны лёгкім і выдатным? Хутчэй за ўсё не. Войны, разрухі, змены ў палітычнай карце Еўропы ўносілі карэктывы ў гісторыю горада і раёна. Але нашы людзі сваімі рукамі і ўчынкамі вакол сэрца нашага краю — Лідскага замка — самаахвярна аднаўлялі цудоўнейшы горад. Амаль 70 гадоў мы жывём у міры і дабрабыце. За гэты час, дзякуючы творчым і таленавітым людзям, Лідчына стала вядомай далёка за межамі Гродзеншчыны, за межамі рэспублікі. Прадукцыя шматлікіх нашых прадпрыемстваў стала візітнай карткай: яе ведаюць у Еўропе і на іншых кантынентах. Ёсць людзі, якія і сёння ствараюць гэты імідж.

Твар любога горада і яго раёна — яго жыхары. Разам з уладальнікамі такога высокага звання ўшаноўвалі і ўдзельнікаў праекта «Гонар Лідчыны». На працягу года па лідскім тэлебачанні расказвалі пра людзей, якія сваімі ўчынкамі праславілі гэты край. Каля гісторыка-мастацкага музея была адкрыта аднайменная скульптура. Яе аўтар — мясцовы аўтар Рычард Груша.

Новая славутасць Ліды ўяўляе сабой аснову з каменя, на якой выбіты спецыяльныя таблічкі ў выглядзе зорак. Кожная з іх прысвоена пэўнай асобе, якая сваёй дзейнасцю праславіла Лідчыну. Сярод іх — былыя кіраўнікі горада і раёна, дырэктары прадпрыемстваў, вайскоўцы, прадстаўнікі духавенства, адукацыі, культуры, мастацтва, спорту, медыцыны...

— Быць у ліку такіх сапраўды выдатных і паважаных людзей — найвышэйшы гонар і яшчэ большая адказнасць, — перакананa **дырэктар гімназіі №1 Наталля ЗАЙЦАВА.** — Я ўспрымаю гэтае заахвочванне як даніну павагі не мне канкрэтна, а Настаўніку, яго вялікай місіі на роднай зямлі, майму калектыву, які робіць школу паспяховай і эфектыўнай. Менавіта ён, гэты цудоўны педагагічны калектыў, узгадоўвае будучыню роднай Лідчыны і Беларусі. Менавіта ён працуе так, што выклікае давер у бацькоў і грамадскасці. Дзякуючы яму, ужо больш за 10 гадоў лідская гімназія з'яўляецца лідарам адукацыі ў Гродзенскай вобласці, уваходзіць у лік лепшых устаноў адукацыі рэспублікі, займае годнае месца на рэспубліканскай дошцы гонару.

Сярод уладальнікаў звання «Гонар Лідчыны» — і **саліст Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Свята» Вячаслаў Статкевіч.** Нарадзіўся ён у маленькай вёсачцы Рэпнікі, што за 15 кіламетраў ад Ліды.

Прыемна, што сёння заклалі зорку, у якой увекавечана маё прозвішча, — прызнаўся Вячаслаў Казіміравіч. — Для Ліды я шмат чаго рабіў і раблю. Колькі магу, прыязджаю сюды, выступаю ў розных іпастасях: ад вядучага да артыста. З горадам звязана ўсё самае лепшае. Вельмі прыемна, што Лідчына дала Беларусі шмат талентаў.

— А ці наведваеце бацькоўскую хату? — не магла не пацікавіцца я.

— Родная вёска, дзякуй Богу, жыве. А вось бацькоўскую хату знеслі мясцовыя ўлады. Праўда, усё роўна прыязджаю сюды. Тут складаюцца мае песні, аб гэтым хутары, дзе я нарадзіўся, мне сняцца сны.

Напрыканцы вядомы спявак дадаў, што ў яго хаце газета «Звязда» бывае кожны дзень.

Вандроўка ў сярэднявечча і фестываль квасу

Лідчане ганарацца сваім гістарычным мінулым. Невыпадкова кажуць, што ў таго народа, які не ведае сваю гісторыю, няма будучыні. А мясцовыя жыхары яе не толькі ведаюць, а і час ад часу туды вяртаюцца.

Любімая гістарычная эпоха для іх — Сярэднявечча. А дзе, як не ў Лідскім замку, туды можна трапіць? Вось і на гэты раз жыхары і госці горада сталі сведкамі рыцарскіх баёў. Каманды з Навагрудка, Мінска і Масквы змагаліся за права першынства ў турніры. Сцены старадаўняга замка, музыка таго часу, рыцарскія даспехі, гук мячоў — і я адчувала сябе жонкай Ягайлы, якая выйшла на балкончык паназіраць за тым, што робіцца ў дварэ.

— Нягледзячы на рэканструкцыю Лідскага замка, якая ўжо знаходзіцца на стадыі завяршэння, кожны дзень яго дзверы адчынены для наведнікаў, — расказала **дырэктар Лідскага гісторыка-мастацкага музея Ганна ДРАБ.** — Акрамя рыцарскага турніру, у адной з вежаў замка можна паглядзець выставу «Сярэднявечча». Пасля завяршэння работ на тэрыторыі замка будзе працаваць рэстаран, у якім стануць гатаваць сярэднявечныя стравы. Адкрыецца крама, дзе можна будзе набыць сувеніры, вельмі падобныя да тых, што прадаваліся тут раней. Маладыя будуць мець магчымасць зарэгістраваць свой шлюб у сценах замка ў духу той эпохі.

... За сценамі замка панавала сялянскае жыццё. З імправізаваных падвор'яў чуліся беларускія песні, пах хатняй ежы дурманіў галаву. Тут, на фестывалі квасу, за права звацца лепшым падвор'ем змагаліся амаль усе сельскія гаспадаркі Лідчыны. Першай на маім шляху сустрэлася падвор'е з маёй малой радзімы — ЛРСУП «Мажэйкава».

— Мы прадстаўляем маёнтак пана Брахоцкага, які некалі жыў на мажэйкаўскай зямлі, — патлумачыла **кіраўнік народнага ансамбля бытавых і шумавых інструментаў «Каханачка» Людміла МАСЕВІЧ.** — У пана была свая стайня, пральня. А яго квасоўня славілася на ўсю Гродзеншчыну! Пазней ён стварыў тут спіртзавод. Невыпадкова лідскі квас сёння ведаюць ва ўсім свеце.

Як і горад, які носіць такую рамантычную назву — Ліда. А я ад'язджаю, і ў маіх думках вядомыя радкі з песні: «Родны мой горад, любоў мая, казка кахання чароўная. Ты, калі ласка, чакай мяне з кожнай дарогі, са шляху расстайнага...»

Вераніка КАНЮТА. Фота аўтара.

Лідскі раён

Лідчане даведаліся пра напад гітлераўцаў у першыя гадзіны вайны.

Юрый ЯРЭМІЧ, дырэктар прыватнага сельгаспрадпрыемства «Ляхавіцкае Агра»:

— Прыехаў у Іванаўскі раён з Гродзеншчыны і ажно 23 гады працаваў у Мастоўскім раёне, пяць — у Ваўкавыскім. Прыемна сёння, у дзень уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, павіншаваць калектыў раённай газеты «Чырвоная звязда» з 70-годдзем. Зычым, каб роднае беларускае слова творцаў дапамагала нам, аграрнікам, вырошчваць высокія ўраджаі, аднаўляць нашы палескія вёскі. Няхай трывалае здароўе, ваша і наша натхненне ў працы, уласная ініцыятыва мацуюць веру ў заўтрашні дзень маладой Рэспублікі Беларусь.

УНН 290986590

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Віктар САСТРАЎЧУК, старшыня праўлення СВК «Кастрычнік-Агра»:

— Ад шчырага сэрца віншую калектыў Іванаўскай раённай газеты «Чырвоная звязда» з 70-годдзем. Вельмі прыемна, што і калгас у родным Дастоеве называўся «Чырвоная звязда»! Узначальваў яго педагог па спецыяльнасці Васіль Гурыновіч, вопытны арганізатар, мудры кіраўнік. Я ж пэўны час працаваў вадзіцелем, потым чатыры гады — сакратаром пярвічнай калгаснай камсамольскай арганізацыі, служыў у Савецкай Арміі пад Ніжнім Ноўгарадам. Цяпер, з мінулага года, — кіраўнік СВК «Кастрычнік-Агра». Разам з нашымі земляробамі зычу творцам Іванаўскай «раёнкі», яе шматлікім чытачам творчага натхнення, моцнага здароўя і прыемных сустрэч з намі, аграрнікамі.

УНН 200075475

ВУЛІЧНЫ ФЕСТЫВАЛЬ: пачатак

Артыст па імені Надвор'е прэтэндаваў на галоўную ролю ў Дзень горада Мінска

А як жа хацелася б мець свой калі не карнавал, то карнавальчык! Ах, Рыа, Рыа... Прыгожыя шэсці, бачаныя па тэлебачанні, распальваюць уяўленне. Але ж тут вам — не там, тут заўсёды любыя вулічныя мерапрыемствы залежаць ад дазволу нябеснай канцылярыі. І хацелі б людзі выйсці і «патусіць», але неба закрылі хмары, а рэдкія мінакі трымаюць напагатове парасоны.

Але паглядзіце на сітуацыю інакш: парасон можа стаць часткай антуражу, а хмары — сцэнаграфіяй, якая толькі правакуе артыстаў іграць лепш, радаваць больш, запальваць усмешкі насуперак усяму.

А калі пачаліся выступленні, спыняліся нават тыя, хто ішоў па справах. І тое, што мы лічылі непераможным (надвор'е) пакрысе адступіла.

Мо перад беларускім духам? Бо ці не самая складаная місія — адкрыць выступы калектываў — выпала на долю музычна-вандроўнага аркестрыка «Вурай». Гэта цуд, але беларускія песні, якія гурт прывозіць з этнаграфічных экспедыцый і прапануе слухачу ў сваёй апрацоўцы, заводзілі нават пад парасонамі! Сцэну акружылі, было жаданне патанчыць пад дудачку.

— Мы не першы раз іграем на пешаходнай вуліцы Карла Маркса, — гаворыць Сяржук Гаюн. — Мы ведаем, што людзі прыйдуць. І для кагосьці наш гурт стане адкрыццём, але прыходзяць і тыя, хто нас ведае, таму што ў асноўным музыкі сёння ў клубах іграюць, у рэстаранах. Але калі ёсць магчымасць паслухаць на вуліцы, з жывым гукам, то чаму не прыйсці? Хоць мне асабіста больш падабаецца, калі нас запрашаюць іграць на прыродзе, дзе побач возера ці рака. Усё роднае... Гарадскі асяродак па-свойму адметны і прыемны. Вулічныя канцэрты даюць больш магчымасцяў знаёміцца з новымі людзьмі, абменьвацца кантактамі. Мы ў асноўным вандруем з гэтай праграмай, якую выконвалі на фестывалі. Яна складаецца з песень розных куткоў Беларусі, прывезеных з маіх уласных экспедыцый. Шмат песень палескіх. Мне цікавае Палессе, там можна знайсці фальклор, які дагэтуль не быў запісаны. Мы такім чынам набіралі на новы дыск. Калі мы працуем з фальклорам, то нам важна захаваць беларускую мелодыку, але падаць ужо ў сучасным гучанні. Перадаць глыбіню, мелодыку, інфармацыю, якая ёсць у беларускіх песнях: адчуванне прыроды, роднага свету. Данесці да людзей гэтую любоў.

Гледачы на вуліцы Карла Маркса як сапраўдныя хіты ўспрымалі старыя песні гурта «Вурай»: «Казачку пра Баламута» ды «Русалкі», танчылі разам. А паслы — падыходзілі і зычылі музыкам поспеху. Любоў творыць цуды. Пад канец выступу ніхто не думаў пра надвор'е.

Перапынак да выступу гасцей з Санкт-Пецярбургу тэатра «Мініяцюр» запаўнялі шпацырам па вуліцы К. Маркса. Ці мэтанакіравана рушылі да іншай пляцоўкі: іх на Маркса было 3. Па дарозе — асобныя сталы з сувенірамі, працы майстроў, рэдкія шапікі з ежай і гарачымі напоямі. Але калі б не дождж... Было б весялей, каб не прыходзілася думаць, чым запоўніць паўзы паміж выступамі. Можа, гэта з-за таго, што некаторыя чаканыя калектывы з-за мяжы не даехалі да Мінска: у Еўропе ёсць попыт на вулічныя тэатры...

Але калі на пешаходнай зоне з'яўляліся артысты, сагравала думка: жыццё наладжваецца! У парыках і грыме ці без іх, у адмысловых строях ці ў вопратцы, якую носяць усе, але яны пачыналі ўцягваць мінакоў у свае дзеі, пачынаўся кантакт, ты не проста назіраў, а станавіўся часткай жыцця вуліцы. А ў яго свае законы і правілы: тут кожны не толькі глядач, але і ўдзельнік. І бліжэй да вечара, да заканчэння, нас — удзельнікаў — было ўжо шмат. Мы перамаглі дождж.

— Мне здаецца, што вулічным выступам больш патрэбны мімы і нешта кшталту «жывых скульптур», — вылучалася смяшлівая дзяўчынка ў кампаніі маладых людзей з «дрэдамі». Яны жыва дзяліліся ўражаннямі ад убачанага. Хлопцы гнулі сваю лінію, сур'ёзную:

— ...Альбо калі ідзеш на тэатр, то ўсё-такі хочацца, каб быў нейкі эксперымент: дзе ж яшчэ яго чакаць, як не ў жывым асяродку? Нешта такое ў тэатра «ЕУЕ» ёсць. А калі яшчэ потым гадаеш: што гэта ўсё значыла, дык наогул «крута», нібыта шараду расшыфроўваеш.

— Ну і інтэлектуал... Расслабся! — усміхнулася дзяўчынка.

Але ўсе разам яны потым рушылі ў Міхайлаўскі сквер, глядзець заключны спектакль ад тэатра «Інжэст», які любое шоу можа ператварыць у інтэлектуальную спрэчку і прапанаваць варыянты для асэнсавання. Спектакль «Залаты век у стылі барока» менавіта такі.

Узгорак ля тралейбуснага прыпынку стаў імправізаваным сцэнай. Ліхтары асвятлялі дзеючых асоб, якія адна за адной з'яўляліся пад прыгожую, узнёслую музыку. Вось маленькія людзі — у іх свае радасці, забавы. Але паралельна з ім існуюць вялікія людзі, амаль багі, у якіх свае адносіны. І нібыта пануе гармонія, дзе ў кожнага персанажа сваё месца. Але гучаць трывожныя матывы. Гармонію парушаюць вялізныя пачвары...

Свята, якое мае Мінск сёння — вынік яго доўгай гісторыі. Яшчэ адной крыніцай, з якой можна даведацца пра яе, стала кніга «Мінск. Лепшы від на гэты горад» Віктара Корбута, якую прадставіў Выдавецкі дом «Звязда». Гісторыя ад XI да XXI стагоддзя з цікавымі фактамі, інтрыгамі мінулага, вялікімі асобамі, якія ў розныя часы наведвалі горад, і людзьмі, якія ў ім жывуць сёння і ўслаўляюць яго ў сваіх творах і справах. Творчыя асобы пішуць яшчэ і пра чалавечыя пачуцці, якія перажываюць нашы сучаснікі. Напрыклад, пісьменнік Дзмітрый Пятровіч прадставіў сваю кнігу «Белая жанчына».

Тэатр «Інжэст» распавядае сваю гісторыю так, каб было зразумела: казка жывая. Вялікія жудасныя істоты ў металічным і з металічным позіркам аглядаюць прысутных. Усе запалоханыя, пераможаныя. Добра б маленькія, але і вялікія нічога не маглі супрацьпаставіць і пахаваліся ў роспачы...

Жах і хаос маглі б панаваць доўга. Каб не маленькія людзі, якія знайшлі паратунак... Яны прывезлі яго на залатым вазку ... І адбыўся цуд. Пачвары спалохаліся. А ён з нейкага сшытка (залатога) прачытаў загад, паводле якога ўсё цяпер павінна ісці толькі добра. Радуюца маленькія. Задаволены былыя вялікія, якія гатовы падпарадкоўвацца залатому чалавеку.

Авацыі былі зусім не вулічныя: мастацтва выходзіць за рамкі ўмоў і само стварае ўмовы.

Вулічнае мастацтва прыстасаванае існаваць у розных умовах. Цікавыя выступленні вулічных артыстаў — гэта і ёсць тая ўмова, пры якой часам не зважаеш на дождж і халаднаватае надвор'е. Форум вулічных тэатраў, які пачынаўся ў пахмурных умовах, здолеў іх перамагчы.

Ларыса ЦІМОШЫК, Фота Анатоля КЛЕШЧУКА. Відэа і больш фота на сайце: www.zviazda.by

ТАЛЕНТ ЯДНАЕ МАЙСТРОЎ

Такая выснова гучала ў выступах мастакоў і музыкантаў, якія ў Дзень горада сабраліся ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі. Тут ва ўрачыстай абстаноўцы была адкрыта выстаўка аднаго партрэта, прысвечаная «зорцы» айчыннай музыкі, харавому дырыжору і педагогу, народнаму артысту СССР Віктару Роўдзе.

Партрэт маэстра стварыў вядомы беларускі мастак Сяргей Салохін. Ці ўдалося фарбамі расказаць пра музыку — пра гэта абменьваліся думкамі жывапісцы, кампазітары, педагогі, грамадскія дзеячы. У гонар славутага дырыжора і педагога спявалі акадэмічны хор Беларускай тэлерадыёкампаніі і Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. З гэтымі калектывамі ў свой час плённа працаваў Віктар Роўда.

Выразным святочным штрыхом, які падкрэсліў непарыўнасць сувязі творчасці маэстра з родным краем, стала выступленне яго землякоў. Са Смаргоні, дзе ў 1921 годзе нарадзіўся Віктар Роўда, на свята прыехаў ансамбль «Кантабіле».

Выстаўка аднаго партрэта — цікавая форма музейнай дзейнасці. Пад адным дахам, у розных залах суседнічаюць творы жывапісцаў розных эпох. Гісторыя грамадства паўстае тут у цеснай повязі з гісторыяй мастацтва. Калі пра выдатную асобу сучаснасці ці мінулага распавядае выдатны мастак-партрэтыст, яшчэ раз пераконваешся: таленты яднаюць майстроў.

Яўген ПЯСЕЦКІ.

■ Падпіска-2013

ПРЫЗЫ — РУПЛІВЫМ ПАШТАЛЬЁНАМ!

...Спроба апытання: «Якая прафесія самая творчая?» — «Настаўнік», «Цырульнік», «Мастак», «Дызайнер», «Экскурсавод», «Хірург»... Колькі спецыяльнасцяў — столькі і думак.
Што, між іншым, чыстая праўда, бо бываюць, на вялікі жаль, нятворчыя падыходы, а вось нятворчых прафесій — няма.

Зрэшты, мяркуйце самі: адзін паштальён з месяца ў месяц (а то і з года ў год) будзе прыносіць «Звязду» (умоўна) тром падпісчыкам на сваім участку і нічога не зробіць для таго, каб іх стала, напрыклад, чатыры. Другі ж пачытае газету сам, раскажа пра яе іншым, выбера некалькі цікавых нумароў і пакіне камусьці пачытаць, прапануе выпісаць на месяц... А там, глядзіш, чалавеку спадабалася: ён аформіў падпіску — на квартал, на гэта паўгоддзе... Як і на наступнае!

Для таго, каб адзначыць працу якраз такіх неабыякавых да справы людзей, «Звязда» і заснавала **конкурс «Прыз — руплівому паштальёну».**

Па выніках падпісной кампаніі на другое паўгоддзе 2013-га іх (паштальёнаў, якія, паводле ўмоў конкурсу, дасягнулі прыросту колькасці падпісчыкаў не менш як на 10 чалавек) аказалася, на жаль, няшмат. Але яны ёсць!

Паводле інфармацыі, пададзенай РУП «Белпошта», першае месца (памер прэміі — па 1,5 мільёна рублёў) прысуджана ***Ліліі Сяргееўне Пінчук з аддзялення паштовай сувязі (АПС-3) г. Паставы і Аксане Вячаславаўне Патапенцы з АПС-1 г. Чачэрска*** (колькасць падпісчыкаў у іх узрасла адпаведна з 44 да 66 чалавек і з 6 да 21!)

Другое месца заваявалі ***Ала Сямёнаўна Вілейта з таго ж АПС-3 г. Паставы і Наталля Міхайлаўна Патапенка з АПС Рагі Гомельскага раённага вузла паштовай сувязі*** (прырост склаў адпаведна 17 і 12 асобнікаў «Звязды»), а памер узнагароджання ад рэдакцыі — па 1 млн рублёў.

Трэцяе месца з памерам прэміі па 700 тысяч рублёў прысуджана ***Марыі Мечыславаўне Круковіч з АПС Юркаўшчына Докшыцкага РВПС і Юліі Алегаўне Шыпнеўскай з АПС-1 г. Светлагорска,*** дзе колькасць падпісчыкаў «Звязды» павялічылася на 13 і 11 чалавек.

Віншуем нашых пераможцаў! Шчыра дзякуем ім за працу. А яшчэ — спадзяёмся, што іх творчы падыход стане прыкладам для іншых паштальёнаў. І тады падпісчыкаў у «роднай газеты на роднай мове» будзе больш. І больш пераможцаў. Бо конкурс працягваецца! А значыць, у паштальёнаў ёсць шанц на новыя ўзнагароды па выніках падпіскі ўжо на IV квартал 2013-га ■

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 8 кастрычніка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Сярод падпісчыкаў 10.10.2013 г. будзе разыграна 7 бясшнуравых тэлефонных апаратаў і суперпрыз — тэлевізар LG. Вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 20.10.2013 г.**

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі **па 31.12.2013 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года і пашпарта. **Пасля 31 снежня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэлефон для даведак (017) 287 18 38.

Правілы рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў газеце «Звязда» за 16.08.2013 г.

Тэрмін правядзення гульні — з 20.08.2013 па 31.12.2013.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 2211 ад 25.07.13, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

5 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або 2-е паўгоддзе 2013 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____

_____

Падпіска аформлена і аплачана ў _____
(аддзяленне сувязі)

_____ на IV кв. або 2-е паўг. 2013 года

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!